Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

***Ю.Ю. Захарына, С.М. Зелянеўская***

# СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА

Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб’яднаннем
па педагагічнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага
дапаможніка для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў,
якія навучаюцца па спецыяльнасцях:
1-02 02 01 Сусветная і айчынная культура;
1-02 02 02 Сусветная і айчынная культура. Дадатковая спецыяльнасць;
1-02 02 03 Сусветная і айчынная культура. Рытміка;
1-02 02 04 Сусветная і айчынная культура. Фальклор

У дзвюх частках

Частка 1

**Ад вытокаў да Сярэднявечча**

Мінск 2011

УДК 7(075.8)
ББК 85я73
З38

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Р э ц э н з е н т ы:
доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ *М.Я. Сяменчык*;
доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М.М. Забаўскі*

**Захарына, Ю.Ю.**

З38 Сусветная мастацкая культура : вучэб.-метад. дапам. У 2 ч. Ч. 1. Ад вытокаў да Сярэднявечча / Ю.Ю. Захарына, С.М. Зелянеўская. – Мінск : БДПУ, 2011. – 228 с.

ISBN 978-985-501-944-3.

У выданні актуалізуюцца пытанні дасягненняў і асаблівасцей выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, горадабудаўніцтва і архітэктуры са старажытных часоў да Сярэднявечча ў розных краінах свету. Выкарыстаны тэарэтычныя працы буйнейшых навукоўцаў па сусветнай культуры адзначанага перыяду, а таксама матэрыялы ўласных даследаванняў аўтараў.

Адрасуецца студэнтам ВНУ, якія навучаюцца па спецыяльнасцях: 1-02 02 01 «Сусветная і айчынная культура»; 1-02 02 02 «Сусветная і айчынная культура. Дадатковая спецыяльнасць»; 1-02 02 03 «Сусветная і айчынная культура. Рытміка»; 1-02 02 04 «Сусветная і айчынная культура. Фальклор», а таксама ўсім, хто цікавіцца праблемамі гісторыі культуры.

**УДК 7(075.8)**
**ББК 85я73**

**ISBN 978-985-501-944-3 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-501-945-0**

© Захарына Ю.Ю., Зелянеўская С.М., 2011
© БДПУ, 2011

# УВОДЗІНЫ

Мастацкая культура з'яўляецца неад'емнай часткай культурна-гістарычнага развіцця чалавечага грамадства. Яе спадчына, пакінутая нам у выглядзе помнікаў архітэктуры, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, утрымлівае ў сабе кадзіраваную інфармацыю аб цывілізацыйных працэсах, узроўні развіцця культуры, асаблівасцях жыцця і быту, навуковых і тэхнічных уяўленнях, мастацкіх прыярытэтах і густах грамадства ў кантэксце эпохі. Ад вытокаў да сучаснасці ў ёй увасабляецца самабытнасць, сфарміраваная ў выніку гістарычнай эвалюцыі. Вывучэнне сусветнай мастацкай культуры дае магчымасць пазнаць спецыфіку творчасці архітэктараў, жывапісцаў, скульптараў, графікаў, мастакоў-рамеснікаў розных народаў, грамадстваў, эпох. Пры вывучэнні эвалюцыі сусветнай мастацкай культуры студэнты атрымліваюць абагульненае ўяўленне аб мадэлі развіцця і трансфармацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей, працэсаў, мастацка-вобразных сістэм.

Ва ўмовах глабалізацыі сучаснага свету, што стала вынікам тэхнакратычнай накіраванасці ў развіцці цывілізацый, вялікае значэнне набывае вывучэнне мастацкай спадчыны, выхаванне да яе павагі і імкнення да захавання. Сучасная постіндустрыяльная культура, характэрнымі рысамі якой сталі тэхнізацыя асяроддзя, адсутнасць трывалых мастацка-эстэтычных канонаў, вылучыла шэраг новых задач. Сярод іх пачэснае месца занялі пытанні развіцця турызму, экалогіі, мінімізацыі матэрыяльна-тэхнічных сродкаў у забеспячэнні спажывецкіх патрэб. У гэтых адносінах вялікае значэнне набыло вывучэнне мастацкай культуры, якое з'яўляецца неабходнай умовай развіцця мастацкага густу, цэласнага і ўсебаковага разумення твораў мастацтва, выпрацоўкі каштоўнасных адносін і павагі да аб'ектаў сусветнай мастацкай спадчыны, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці.

Актывізацыя турызму як прыярытэтнага кірунку ў развіцці маштабных сацыякультурных сувязей паміж дзяржавамі еўразійскага, амерыканскага, афрыканскага, аўстралійскага кантынентаў спрыяла пашырэнню ўяўленняў аб паступовым развіцці цывілізацый і іх адметнасцях, замацаваных ва ўнікальным ландшафце, архітэктурных помніках, мастацкай спадчыне. Узмацненне ўзаемаадносін паміж еўрапейскімі і азіяцкімі дзяржавамі адкрыла новыя магчымасці пазнання культур блізкага і далёкага замежжа. Лакалізацыя новых цэнтраў развіцця турызму ў краіны Блізкага (Егіпет, Ірак (Месапатамія), Тур-

цыя (Візантыя)) і Далёкага Усходу (Кітай, Японія, Карэя, Манголія), Азіі (Індыя, Іран, Грузія, Арменія, Азербайджан, Узбекістан), на мастацтва якіх у дапаможніку звяртаецца асаблівая ўвага, адкрыла новыя перспектывы ў вывучэнні сусветнай мастацкай культуры.

За апошнія гады мастацтвазнаўства і культуралогія ўзбагаціліся новым зместам. Маштабныя даследаванні, звязаныя з праблемамі стылю, мастацкага вобраза, кампазіцыі, ансамбля, каларыстыкі, дазволілі вылучыць найбольш істотныя і значныя аспекты ў галіне сусветнай мастацкай культуры, вызначылі канцэпцыі і метадалогію вывучэння мастацкай культуры, далі цэласнае ўяўленне аб гісторыі развіцця мастацтва ад вытокаў да сучаснасці.

Упершыню вывучэнне сусветнай мастацкай культуры прадугледжваецца на аснове герменеўтычнага падыходу. Яго сутнасць заключаецца ў арганізацыі педагагічнага працэсу з дапамогай спецыяльных метадаў і прыёмаў, накіраваных на ўсведамленне асобай сэнсу, значэння, разуменне зместу твораў мастацтва, фарміраванне здольнасці вылучаць спецыфічныя адрозненні мастацкай культуры розных народаў пэўных гістарычных перыядаў, асабліва на эстэтычнае развіццё асобы, яе асобасных якасцей. Разуменне, дакладнае ўспрыманне, інтэрпрэтацыя твора мастацтва немагчымы без яго пазнання, якое выступае як творчы працэс атрымання і паступовага абнаўлення ведаў аб якой-небудзь з'яве, працэсе і мастацтве. Працэсы разумення і пазнання асобай мастацтва здзяйсняюцца па прынцыпе герменеўтычнага кола, які прадугледжвае паступовы працэс, на кожным этапе якога дасягаецца пэўны ўзровень трактоўкі мастацкай з'явы або твора. У дадзеным дапаможніку герменеўтычны падыход будуецца як сіметрычна-гнасіялагічны. Пачатковым узроўнем разумення і пазнання выступаюць адпаведна папярэднія разуменне і пазнанне. Для кантролю першаснага этапу дыялогу з мастацтвам аўтарамі прапанаваны шэраг варыятыўных заданняў, выкананне якіх будзе спрыяць фарміраванню асноў ведаў студэнтаў і складзе базу для далейшых зносін з мастацтвам на наступнай стадыі, што дасць магчымасць павысіць узровень іх эстэтычнай выхаванасці.

Герменеўтычны падыход прадугледжвае вызначэнне аптымальных шляхоў арганізацыі педагагічнага працэсу з мэтай дасягнення высокага ўзроўню эстэтычнай выхаванасці будучых спецыялістаў у галіне сусветнай і айчыннай культуры на аснове ўліку асаблівасцей мовы мастацтва, яе разумення, герменеўтычных форм інтэрпрэтацыі твораў мастацтва (стылявой, гістарычнай, эстэтычнай), спасціжэння мастацкай задумы асобнага твора ў яе супастаўленні з ідэаламі эпохі.

Інтэрпрэтацыя мастацкага твора заўсёды мае глыбокую задуму, якая прадугледжвае пераадоленне культурнай аддаленасці, што аддзяляе асобу ад твора ў часе, у імкненні паставіць рэцыпіента і твор мастацтва на адзін узровень і, такім чынам, уключыць вобраз гэтага твора ў працэс разумення. Такі спосаб асваення свету мае на мэце выхаванне эстэтычных пачуццяў асобы, асэнсаванне эстэтычных каштоўнасцей сусветнага мастацтва.

Аснову зместу вучэбна-метадычнага дапаможніка вызначаюць матэрыялы і вынікі навуковых даследаванняў у галіне мастацтвазнаўства. Аўтары дапаможніка абапіраюцца на вучэнні вядучых айчынных і замежных тэарэтыкаў архітэктуры і мастацтва, культуролагаў, эстэтыкаў (В. Аляксандрава, М. Алпатава, Н. Вінаградавай, Э. Віале ле Дзюка, Б. Віпера, М. Вітрувія, І. Маца, П. Гнедзіча, А. Гальдштэйна, Э. Гомбрыха, Н. Дзмітрыевай, Э. Дубянецкага, А. Іконнікава, Т. Ільінай, Б. Лазукі, Л. Любімава, А. Марана, І. Марозава і інш.). У змест выдання ўключаны вынікі навуковых даследаванняў Ю. Захарынай і С. Зелянеўскай, матэрыялы, атрыманыя аўтарамі падчас наведванняў і экспедыцый па краінах Еўропы.

Вучэбна-метадычны дапаможнік прызначаны для студэнтаў спецыяльнасцей 1-02 02 01 «Сусветная і айчынная культура», 1-02 02 02 «Сусветная і айчынная культура. Дадатковая спецыяльнасць», 1-02 02 03 «Сусветная і айчынная культура. Рытміка. Харэаграфія», 1-02 02 04 «Сусветная і айчынная культура. Фальклор», а таксама для навучэнцаў і выкладчыкаў мастацтвазнаўчага і культуразнаўчага профіляў адукацыі.

***Мэта вучэбнай дысцыпліны «Сусветная мастацкая культура»*** – вызначэнне гістарычных вытокаў, адметных рыс і эвалюцыі мастацтва ад старажытнасці да пачатку XXI ст.

Пры вывучэнні мастацкай культуры краін сувету перад студэнтамі ставяцца наступныя задачы:
- аваладанне мастацтвазнаўчай тэрміналогіяй;
- засваенне ведаў аб эвалюцыі мастацкіх стыляў, кірункаў, іх характэрных асаблівасцях, аб творчасці буйнейшых мастакоў, архітэктараў свету;
- фарміраванне навыкаў аналізу мастацкіх твораў;
- развіццё ўменняў вылучаць традыцыйныя і наватарскія рысы ў мастацтве асноўных гістарычных перыядаў і сучаснасці;
- інтэлектуальнае, маральнае і эстэтычнае развіццё;
- выпрацоўка ўласнага светапогляду, спосабаў і форм зносін паміж людзьмі.

У раздзелах дапаможніка раскрываюцца тэарэтычныя аспекты мастацкай культуры, выяўляюцца асаблівасці горадабудаўнічага развіцця, архітэктуры, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ад першабытных часоў да пачатку XXI ст. у краінах Усходу, Еўропы, Амерыкі, Афрыкі, Аўстраліі. Асаблівая ўвага надаецца нацыянальным асаблівасцям мастацтва, стылявой характарыстыцы, узаемасувязі відаў і жанраў мастацтва ў розныя гістарычныя перыяды, цэласнасці і своеасаблівасці мастацкай культуры розных эпох і народаў, вынаходніцтвам і адкрыццям у галіне мастацкай дзейнасці. Спецыфіка мастацкай культуры розных часоў і народаў раскрываецца на яскравых прыкладах (ілюстрацыі змешчаны ў дадатку). Найбольш значныя мастацтвазнаўчыя тэрміны прыведзены ў слоўніку. Пасля кожнай тэмы прапануюцца пытанні і заданні, у канцы раздзелаў – кантрольныя пытанні ў форме тэстаў (адказы прыведзены на старонцы 177 дапаможніка).